УДК [321+340]

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ, СОЙМ І РАДА Ў ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМЦЫ І ПРАВЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XV–XVI СТАГОДДЗЯЎ

***канд. юрыд. навук, дац. Д.В. ШЧЭРБІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца развіццё ідэй дзяржаўнага суверэнітэта і абмежавання ўлады манарха шляхецкімі саслоўна-прадстаўнічымі органамі ў гісторыі палітычнай і прававой думкі і права Вялікага Княства Літоўскага ў XV–XVI стагоддзях. Даследуецца ўзнікненне дадзеных ідэй у гісторыі Заходняй Еўропы, іх распаўсюджванне ў Польшчы, а потым і ў Княстве. Вывучаюцца палемічныя творы прадстаўнікоў Кароны Польскай і Вялікага Княства Я. Астрарога, С. Ажэхоўскага і іншых, рэцэпцыя імі ідэй Арыстоцеля аб змешаным урадзе. У працы адзначаецца адрозненне пазіцый элітаў Княства Літоўскага і Польшчы па пытаннях ролі манарха, правоў Рады і Сойма. Паказваецца, як ідэі незалежнасці ад Папства і Імперыі, ідэі шляхецкай дэмакратыі рэалізоўваліся ў практычнай дзейнасці і замацоўваліся ў асноўных праўных дакументах эпохі.*

***Ключавыя словы:*** *Вялікае Княства Літоўскае, права, дзяржаўны суверэнітэт, роля манарха, правоў Рады і Сойма, палітычная і прававая думка.*

Фарміраванне і ўкараненне ідэй аб незалежнасці нацыянальных дзяржаў, развіццё ідэй аб прадстаўнічым праўленні прайшло доўгі шлях, які распачынаўся ад эпохі Сярэдніх вякоў. Узнікшыя ў найбольш развітых краінах падобныя ідыялагемы паступова ўспрымаліся іншымі дзяржавамі, рэалізоўваліся праз прызму мясцовых асаблівасцей. Для іх абгрунтавання дапасоўваліся і выкарыстоўваліся погляды аўтараў, што маглі адносіцца да іншых часоў ці цывілізацый, напрыклад, творы Антычнасці ці Арабскага Усходу.

**Асноўная частка.** “Папская рэвалюцыя” XI–XII стагоддзяў фактычна падштурхнула развіццё свецкіх палітычных ідэй. Да гэтага асноўная дыскусія ў межах хрысціянскага свету абапіралася выключна на Св. Пісанне і датычылася пытання вяршэнства ўлады ў *Christianitas*. Папа Рымскі ды Імператар сумесна прадстаўлялі ўніверсальную *Respublica christiana або Sacrum Imperium* і спрэчкі вялася толькі па пытанні прымата адной з дадзеных улад: ці Імператар атрымлівае ўладу ад Бога праз Папу, ці напрамую, і ў сваю чаргу надзяляе Папу, біскупаў ды мясцовых каралеў уладай (інвеститурай) [1, с. 369].

Дзеянні Грыгорыя VII і яго наступнікаў фактычна прывялі да фарміравання прататыпа навачаснай дзяржавы – Каталіцкай царквы [2, с. 118, 119–120], якая ўжо абапіралася не на прыватнае права (леннае), а фактычна на права публічнае (інстытуцыйнае) – кананічнае права. Вымушаны падзел юрысдыкцыі між свецкай і духовай уладай як вынік барацьбы Папства і Імператара, але і адначасовае абгрунтаванне іх рознасці (па крыніцах, мэтах і г.д.) у палітыка-тэалагічных дыскусіях аб’ектыўна вялі да лаіцызацыі свецкай улады, пошуку легістамі аргументаў па-за духоўных крыніц і Св. Пісьма.

Менавіта тут узнікае патрэба ва ўзнікненні апеляцый да народа як крыніцы ўлады. Запатрабаваная палітычнымі інтарэсамі рэцэпцыя Арыстоцеля ды рымскае права прывялі да змены сярэднявечнай парадыгмы ўлады. Ужо не Бог праз народ рэалізуе ўладу, але дзяржава ёсць выключна справа людзей і для людзей [1, с. 523]. Так, Марсілій з Падуі пісаў: “… згадзімся з ісцінай і меркаваннем Арыстоцеля..., што дзейснае паўнамоцтва заснавання ды выбару ўлады (уладара) належыць народу. Яму таксама прыналежыць заканадаўчая ўлада… Толькі заканадаўца валодае правам вызначаць правіцеля і нават здымаць яго, калі гэта патрэбна для агульнага дабра” [3, с. 147].

Эканамічныя ды сацыяльныя змены прывялі да ўзвышэння нацыянальных каралеўстваў. І тыя ідэі, якія выкарыстоўваліся ў дыскусіях між папствам і імператарам, былі адаптаваныя да абгрунтавання каралеўскага суверэнітэту. Так, ужо ў XIII стагоддзі ў Францыі выкарыстоўваўся прадзяржаўны тэрміналагічны апарат, вылучаліся асобна каралеўская ўлада і Карона, дынастыя пачынала ўвасабляць нязменную ўладу манарха [1, с. 378]. І падчас канфлікту Філіпа IV Прыгожага з Папай Баніфацыям VIII пачынае гучаць: “Кіраўніцтва пытаннямі зямнымі каралеўства прыналежыць толькі да караля і ні да нікога іншага, і не прызнае ён нікога над сабой…” [1, с. 378].

Трэба аднак адзначыць, што размова ў дыскусіях вялася не пра рэальную абсалютную ўладу, а хутчэй пра юрыдычнае вяршэнства. Імператар, каралі выкарыстоўвалі рымскі тэрмін “imperium” хутчэй як сінонім “абстрактна зразумелай дзяржавы, яе кампетэнцыі, права – мае яно характар безасабовы” [1, с. 367]. Змаганне за imperium цалкам магло спалучацца з аўтаноміяй каралеўстваў, правінцый, станаў феадальнага грамадства. Быць імператарам магло цалкам натуральна спалучацца з прынцыпам абрання князямі, з існаваннем Рэйхстага, Генеральных станаў і г.д.

Да таго ж адаптаваны Арыстоцель дазваляў выкарыстоўваць у дыскусіі катэгорыю “сярэдні клас”, якую можна было ўжыць не толькі як сінонім заможнага мяшчанства, але і як сінонім шляхты ці нават князёў [1, с. 585]. І калі гэтыя ідэі выкарыстоўвалі манархі, то вельмі проста іх было запазычыць і для абмежавання іх улады, што і адбылося ў наступныя стагоддзі.

Славянскія землі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы знаходзіліся падчас гэтых дыскусій на перыферыі заходнееўрапейскай цывілізацыі. Калі ў Заходняй Еўропе ў XI–XII стагоддзях ажыццяўляўся пераход да развітога феадальнага грамадства і саслоўнай дзяржавы, то ў славянскія дружынныя дзяржавы ў гэты час толькі пачалі пранікаць феадальныя адносіны. Праз палітычныя і асабістыя кантакты, прыняцце каталіцтва, нямецкую каланізацыю і экспансію, усведамленне неабходнасці пераходу ад дружыннага войска да рыцарскага, якое абапіраецца на воінаў-рыцараў, якія аселі на зямлю, саслоўныя асновы ўкараняліся ў заходнеславянскія дзяржавы. У славянскіх краінах Цэнтральнай Еўропы з XI–XII стагоддзяў узмацняюцца індывідуальныя правы сялян на надзелы, а знаць, асабліва з XIII стагоддзя, пачынае атрымліваць ад князёў зямлю і імунітэтныя прывілеі, прынятыя ў Заходняй Еўропе [4, с. 39].

Да XIV стагоддзя Польшча ўжо ўяўляла сабой станавую манархію заходнееўрапейскага ўзору з адасабленнем дзяржавы (Кароны Польскай) ад асобы кіраўніка [5, с. 16], а ідэя незалежнасці караля ад Папства ды Імперыі ўкаранілася толькі пад канец XV стагоддзя [5, с. 16]. Яе выразнікам быў Ян Астрарог, саветнік караля і Вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелончыка і караля польскага Яна Ольбрахта, аўтар знакамітага Мемарыяла аб выпраўленні Рэчы Паспалітай *(лац. Monumentum pro Reipublicae ordinatione*). У сваім творы ён абвяшчае, што “кароль польскі ніякага верхавенства, акрамя самаго Бога, над сабой не прызнае” [6, с. 129]. Пры гэтым кароль, “які не падлягае нічыёй уладзе мае ўсе правы цэзара” [6, с. 131]. З тэксту працы бачна, што пад цэзарскімі правамі як раз маецца на ўвазе незалежнасць дзяржавы, бо ў шэрагу артыкулаў аўтар разважае пра дзейнасць сойма і яго паслоў.

Менавіта ў тыя ж часы ў Польшчы распачынаецца экзекуцыйны рух, які шмат у чым апелюе да антычнай канцэпцыі змяшанага ўраду, то бок такога, у якім суіснуюць элементы манархіі (кароль), арыстакратыі (сенат) ды дэмакратыі (пасольская ізба). Рух працягваў традыцыі эмансіпацыі сярэдняй шляхты, што распачаліся яшчэ Кошыцкім прывілеем 1374 года і Нешаўскімі прывілеямі 1454 года.

Актыўнасць у XV стагоддзі ў Каралеўстве Польскім соймікаў, правінцыйных соймаў ды вальных соймаў фактычна прывялі, па меркаванні Ю. Бардаха, да нараджэння ў 1493 годзе парламента ў сучасным разуменні гэтага слова, які складаўся з двух палат [7, с. 13]. Адзін з важнейшых лозунгаў экзекуцыяністаў знайшоў свой выраз у соймавай канстытуцыі 1505 года “Nihil novi”, якая пастанаўляла, што “нічога новага” не можа быць ухвалена без згоды сойма, і што вальны сойм вянчае сістэму прадстаўнічых органаў каралеўства.

У Вялікім Княстве Літоўскім працэс станаўлення сталага саслоўнага грамадства і феадальнай дзяржавы і права адбываўся яшчэ больш марудна. Як і ў выпадку з заходнімі славянамі некалькімі стагоддзямі раней, замежны ўплыў абумовіў паскарэнне працэсаў феадалізацыі, змены тыпу дзяржавы і права. Неабходнасць барацьбы з нямецкай і мангольскай агрэсіяй, саперніцтва ў аб’яднанні славянскіх зямель на Усходзе з Маскоўскім княствам і іншыя ўнутраныя і знешнія прычыны выклікалі заключэнне уніі паміж ВКЛ і Польшчай у 1385 годзе.

Ацэньваючы ўплыў Крэўскай уніі на развіццё грамадства і правы ВКЛ, Ю. Бардах прыводзіць і згаджаецца з меркаваннем М. Доўнар-Запольскага і Г. Лаўмянскага аб тым, што ў гэты перыяд мела месца паскораная эвалюцыя грамадства Вялікага Княства ў напрамку развітога саслоўнага ладу, эвалюцыя, заснаваная на «пераскокванні» княствам перыяду індывідуальных прывілеяў [8, с. 40].

Абмінаючы перыяд індывідуальных прывілеяў, у ВКЛ з 1387 года пачынаюць выдавацца, са спасылкай на польскі прыклад, агульназемскія прывілеі, якія даюць шляхце феадальныя саслоўныя імунітэты і прывілеі. Пастутова, пачынаючы з канца XIV стагоддзя, фарміруецца феадальнае станавае права.

Паралельна адбываецца і афармленне саслоўнага прадстаўніцтва магнатаў ды шляхты. Так, у 1398 годзе Вітаўт сабраў з’езд феадалаў на востраве Салін, а ў 1401 годзе ў заключэнні Віленска-Радамскай уніі прымалі ўдзел 30 баяраў (але ўсяго адзін князь і адзін маршалак) як прадстаўнікі «крэўных і родных». Ліцвінскае прадстаўніцтва, маючы саслоўны характар, абапіралася на жывую ў сучаснай ім Літве радавую арганізацыю магнатаў і вышэйшага баярства, а не на прынцып земскай, гэта значыць тэрытарыяльнай, арганізацыі шляхты, якая дамінавала ўжо ў суседняй Польшчы. Так даўніна мяшалася з навізной [8, с. 45].

Падобнае назіраецца і пры заключэнні Гарадзельскай уніі 1413 года, калі 47 прадстаўнікоў літвінскіх родаў, якіх Вітаўт сам абраў, заключылі пабрацімства з польскімі феадаламі і атрымалі права ўдзельнічаць у выбары вялікага князя, даваць згоду на абранне польскага караля.

Паскарэнне працэсу феадалізацыі, забяспечаная насаджэннем яго зверху, першапачаткова выклікала адчужэнне ў асяроддзі членаў дынастыі і мясцовых князёў. Перш за ўсё знаходзіла неразуменне новая канцэпцыя ўлады, якая прадугледжвала аддзяленне асобы кіраўніка ад паняцця дзяржавы. У падоб-

най сітуацыі, як адзначае Ю. Бардах, мазавецкія князі згаджаліся прынесці прысягу вернасці толькі каралю, а "не Кароне Каралеўства, сцвярджаючы, што калі б прысягнулі кароне, то кожны з кароны мог бы іх лічыць сваімі леннікамі, і яны лепш памруць, чым зазнаюць гэткі сорам" [8, с. 38].

Пасля Крэўскай уніі на Вялікае Княства Літоўскім распаўсюдзілася новае ўяўленне аб каралеўскай уладзе, якое ўзнікла ў Заходняй Еўропе пасля "Папскай рэвалюцыі" і ўключала прызнанне заканадаўчай ролі вялікага князя. З канца XIV стагоддзя ў Княстве ўзрасла заканадаўчая актыўнасць князя: выдаваліся агульнадзяржаўныя прывілеі, якія змяшчалі нормы як публічнага, так і прыватнага права, прычым колькасць апошніх паступова ўзрастала.

Ідэі незалежнасці княскай улады, незалежнасці ВКЛ ад улады Папства ці Імперыі спалучаліся з мясцовымі незалежніцкай, якая абгрунтоўвала яшчэ незалежнасць Кіеўскай Русі ад Візантыі, і цэзарапапісцкай ці нават дахрэсціянскай традыцыямі дамінавання князя над царквой. Звесткі, якія прыводзіць А.В. Дзерман, указваюць на тое, што яшчэ ў дачыненні да Альгерда часам выкарыстоўвалі тытул basileus, які адпавядаў лацінскаму "імператар". Вітаўта таксама часам называлі царом, ці нават "імператарам Літвы" [9, с. 524–525]. Гэтай жа мэце служыць і слыннае паданне пра Палемона, што выводзіць вялікакняскі род з цэзараў Рыму [10, с. 679–680]. Таму не дзіўным выглядае і патрыятычны пафас Ф. Скарыны ў яго вядомым выслоў'і, або яго меркаванне пра адметнасць законаў у кожнага народа [11, с. 335]. Яшчэ больш выразна гэтую думку выказаў аўтар ананімнай працы (верагодна, Аўгусцін Ратондус [12, с. 644], выдадзенай у ВКЛ "Размова паляка з літвінам" (1564 г.): "Няхай кіруе кароль, а каралём ніхто не кіруе, адзінае Бог і закон" [13, с. 50].

Калі з пытаннем незалежнасці дзяржавы прадстаўнікі палітычнай думкі Польшчы і Вялікага Княства пагаджаліся, то ў пытанні ўзаемадзеяння органаў улады ўнутры краіны і ролі шляхты пазіцыі адрозніваліся.

У Польшчы рэцэпцыю ідэй Арыстоцеля аб змешанай форме кіравання ажыццяўлялі А.Ф. Маджэўскі, Л. Гарніцкі, В. Гасліцкі і іншыя. Але калі той жа Маджэўскі настойваў на далучэнні мяшчанства да кіравання краінай, то найбольш знаным абаронцам і вестуном ідэй "шляхецкай дэмакратыі ў сярэдзіне XVI стагоддзя быў С. Ажэхоўскі. Менавіта між ім і ананімным аўтарам "Размовы" адбылася дыскусія, якая аказала значны ўплыў на развіццё дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. У сваіх творах: "Размовы, або дыялог пра экзекуцыю Польскага каралеўства" (1563); "Quincunx, гэта значыць узор Польскага каралеўства, зроблены з цынку" (1564); "Паліцыя Польскага каралеўства" (1565) – С. Ажэхоўскі праслаўляе "польскую свабоду", якую бачыць у прывілеях шляхецкага стану. Кароль у Ажэхоўскага выступае як слуга дзяржавы, які кіруе так, як патрабуе агульнае дабро: " У хрысціян summa summarum respublica est, rex servus reipublicae, id justum in regno, quod reipublicae utile" [14, с. 76]. Ен піша, што нідзе, як толькі ў Польшчы, кароль забараніў сябе слухаць, калі ён будзе супрацьпраўна што прыказваць, толькі тут манарх прымае законы са згоды рады і рыцарства [14, с. 76], і ўсе, і манарх, і падданыя, і бедныя, і багатыя пад правам жывуць, правам між сабой зраўняныя [14, с. 77]. Кароль толькі страж прывілеяў каронных, язык правоў грамадства [14, с. 79].

У адрозненне ад каралеўстваў, кожнае княства, у тым ліку Літва, з'яўляецца няволей, падданыя князя ніякай абароны ад яго крыўдаў не маюць, валодае ён імі, можа забіць, прадаць, перадаць каму хоча і калі хоча [15, с. 226]. Ажэхоўскі параўноўвае правы князя з сваімі правамі як памешчыка ды ўдакладняе, што толькі таму Ягайла мог так лёгка вырашыць пытанне пра інкарпарацыю княства ў Польшчу, што быў у княстве неабмежаваным уладаром. Таму зараз, на яго думку, шляхта ВКЛ павінна прагнуць злучэння з Каронай у "адно цела, сэрца і душу", каб атрымаць свабоду і такія ж правы як падданыя польскага караля [15, с. 228].

Аўтар жа напісанай ў адказ "Размовы паляка з літвінам" адмаўляе тыранічны характар ВКЛ, крытыкуе выбарнасць манарха [15, с. 60–61], лічыць польскую свабоду свавольствам [15, с. 36–37], спасылаючыся на Платона, выступае за моцную ўладу караля [15, с. 40], які пры гэтым прыслухоўваецца да рады духовай і свецкай, якая завецца сенатам, і вучыць яго як волі божай, так і правам паспалітым [15, с. 50].

Па меркаванні даследчыкаў, пазіцыя аўтара размовы адлюстроўвала як рэаліі ВКЛ, у тым ліку мацнейшую ўладу спадчыннага князя, большую ролю магнатаў, чым шляхты, так і пазіцыю паноў-радных па развіццю дзяржавы і іх адносіны да польскіх праектаў інкарпарацыі краіны [12, с. 672].

Сапраўды, спачатку маленства Казіміра Ягелончыка, а потым і адсутнасць вялікага князя ў дзяржаве ў сувязі з сумяшчэннем ім каралеўскага трона Польшчы і княскага ВКЛ, перадача манархам велізарных зямельных угоддзяў панам-радным прывялі ў канцы XV стагоддзя да актыўнага ўдзелу Рады ў заканадаўчай дзейнасці. Па прывілею Аляксандра 1492 года вялікі князь ужо не можа адмяняць або змяняць пастановы, прынятыя ім са згоды паноў-рады, а «пастановам і справам», перададзеным для «абгаворвання» ў Раду, «выконваць тое, што яны радзілі» [16, с. 48]. Прывілей Жыгімонта Старога 1506 года яшчэ больш павялічыў паўнамоцтвы Рады, усклаўшы на вялікага князя абавязак не тлумачыць і не змяняць старых і не прымаць новых статутаў і звычаяў без ведама і згоды паноў-рады [17, с. 53].

Аднак паступова шляхецкі сойм ВКЛ, які ў XV стагоддзі толькі эпізадычна збіраўся, з пачатку XVI стагоддзя набывае сталы характар. І хоць спачатку ён хутчэй уяўляў сабой пашыранае пасяджэнне Рады, але паступова пад польскім уплывам і дзякуючы сваёй вялікай ролі ў войнах з Маскоўскай дзяржавай шляхта праз "палявыя соймы" пачынае дамагацца большых правоў [8, с. 162].

Вымагаючы правы праз патрабаванне уніі з Польшчай, шляхта, напрыклад, на Віцебскім польным сойме 1562 года яўна парывала са сваім падпарадкаваннем магнатэрыі. У бліжэйшыя гады іх перамога стала поўнай. Так, Віленскім прывілеем 1563 года была скасавана няроўнасць шляхты па рэлігійнаму прызнаку, Бельскім прывілеем 1564 года былі скасаваны апошнія судовыя экземпцыі і магнаты падпарадкаваліся тым жа судам, што і шляхта, была праведзена судовая рэформа, якая стварыла выбарныя шляхецкія суды. Гэты ж прывілей зацвярджаў Другі статут Вялікага Княства Літоўскага. Па Віленскаму прывілею 1565 года была ўпарадкавана колькасць і акрэслена кампетэнцыя павятовых соймікаў. Завяршала эмансіпацыю шляхты ўхвала Берасцейскага сойму 1566 года, якая ўводзіла папраўкі ў Статут, гэта дазваляла свабодна ажыццяўляць распараджэнне спадчыннымі маенткамі.

Паводле Статута шляхта дамаглася афіцыйнага замацавання свайго ўдзелу ў заканадаўчым працэсе. Так, Статут Вялікага Княства Літоўскага змяшчаў трэці раздзел, што быў названы "А вольнасцях шляхецкіх…", артыкул 12 якога гарантаваў захаванне і выкананне ўсіх раней выдадзеных прывілеяў, а ўвядзенне новых абумоўліваў згодай вальнага сойму, рады і ўсіх зямель дзяржавы [18, с. 82]. Артыкул 2 раздзела другога статута, у сваю чаргу, адзначаў, што ў падобным парадку прымаюцца і рашэнні аб вайне і падатках [18, с. 66–67].

Незалежнасць краіны таксама падкрэслівалася нормамі Статута 1566 года. Так, артыкулы 1 і 3 раздзела трэцяга замацоўвалі недатыкальнасць межаў ВКЛ [18, с. 82], а артыкул 9 гэтага ж раздзела паўтараў норму папярэдняга Статута 1529 года аб забароне займаць пасады і раздаваць маёнткі ў дзяржаве іншаземцам [18, с. 81].

**Заключэнне.** Ідэя незалежнасці краіны ад універсальных цэнтраў улады ў XVI стагоддзі безумоўна ўспрымалася элітамі Вялікага Княства Літоўскага. На першы план пачынае выходзіць пытанне суверэнітэту ва ўзаемадачыненнях з суседнімі краінамі, а пасля заключэння Люблінскай уніі размова ўжо ідзе пра суверэнітэт Рэчы Паспалітай.

Ідэі ж змяшанага ўрада і "залатых" шляхецкіх вольнасцей у канцы XVI–XVII стагоддзі стала ўвайшлі ў канструкт сармацкай ідэалогіі Рэчы Паспалітай. "Рымскі" ўзор стаў абгрунтаваннем нязменнасці дзяржаўнага ладу краіны і бар'ерам на шляху ўсялякім прапановам па рэформе краіны, што ў канцы XVIII стагоддзя прывяло да няздольнасці дзяржавы вырашыць унутраныя і знешнія праблемы і супрацьстаяць захопніцкім імкненням суседзяў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Wielomski, A. Teokracja papieska 1073–1378. Myśl polityczna papieży, papalistów i ich przeciwników / A. Wielomski. – Wydawca: Von borowiecky, 2011. – 696 s.
2. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования / Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ; Изд. гр. ИНФРА-М–НОРМА, 1998. – 624 с.
3. Падуанский, М. Защитник мира. Defensor paris / Марсилий Падуанский; пер. с фр. Б.У. Есенова; науч. ред., вступ., ст., примеч. Г.П. Лупарева. – М.: Изд.-торговая корпорация «Дашков и К°», 2014. – 656 с.
4. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Линодорский, М. Пиетрчак; пер. с пол. – М.: Юрид. лит., 1980. – 560 с.
5. Kucharczyk, G. Polska myśl polityczna do roku 1939 / G. Kucharczyk. – Wyd.: Dębogóra, 2011. – 550 s.
6. Ostroróg, J. Monumentum pro Reipublicae ordinatione / J. Ostroróg // Pawiński, A. Jana Ostroroga żywot i pismo o naprawie rzeczy pospolitej: Studyum z literatury politycznej XV wieku. – Wdruk. S. Orgelbranda synów, 1884. – S. 121–181.
7. Dzieje Sejmu Polskiego / Juliusz Bardach [et al.]. – Wyd. 2 popr. i uzup. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 1997. – 391 s.
8. Бардах, Ю. Крэва і Люблін. З праблемаў польска-літоўскай уніі / Ю. Бардах // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага [укл. Г. Сагановіч; пер. з пол. мовы М. Раманоўскага; перакл. з фр. мовы А. Істоміна]. – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 16–99.
9. Дзерман, А.В. Рэцэпцыя імперскай ідэі ў ВКЛ / А.В. Дзерман // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько [і інш.]; Нац. акад. Беларусі; Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – С. 523–529.
10. Хроніка Быхаўца // Летапісы і хронікі Беларусі: Сярэднявечча і раннемадэрны час [укл. В.А. Варонін; прадмова: В. Варонін, М. Улашчык]. – Смаленск: Інбелкульт, 2013. – С. 679–746.

11. Скарына, Ф. Прадмова да кнігі Другі закон / Ф. Скарына // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая пал. XVIII ст. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; падрыхт. А.І. Богдан і [інш.]; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – С. 334–337.
12. Бортнік, І.А. "Размова Паляка з Літвінам" / І.А. Бортнік // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне / С.І. Санько [і інш.]; НАН Беларусі Беларусі; Ін-т філасофіі. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – С. 643–683.
13. Rozmowa Polaka z Litwinem 1564 / wydał Jozef Korzeniowski. – Krakow: W druk. C.K. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1890. – 91 s.
14. Orzechowski, S. Rozmowa albo Dyalog około exequcyjej polskiej korony / S. Orzechowski // Stanisława Orzechowskiego polskie dialogi polityczne: (Rozmowa około egzekucyjej i Quincunx), 1563–1564 / Wyd. Łoś J. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1919. – S. 1–139.
15. Orzechowski, S. Quincunx to jest Wzór Korony Polskiej / S. Orzechowski // Stanisława Orzechowskiego polskie dialogi polityczne: (Rozmowa około egzekucyjej i Quincunx), 1563–1564 / J. Wyd.Łoś. – Kraków: Akademia Umiejętności, 1919. – С. 141–288.
16. Прывілей Вялікага князя Літоўскага Аляксандра 1492 года // Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – С. 45–51.
17. Агульназемскі прывілей Вялікага князя Літоўскага Жыгімонта Казіміравіча 1506 года / А.Ф. Вішнеўскі // Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мінск: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – С. 52–55.
18. Доўнар, Т.І. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.

*Паступіў 14.03.2016*

## THE INDEPENDENT OF STATE, THE SEJM AND RADA IN POLITICAL THOUGHT AND LAW IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE XV–XVI CENTURIES

***D. SHCHERBIK***

*The article is devoted to the development of ideas of national sovereignty and the limits on the power of the monarch by gentry class-representative bodies in the history of political and legal thinking and law of the Grand Duchy of Lithuania in the XV–XVI centuries. The article examines the emergence of these ideas in the history of ideas in Western Europe, their distribution in Poland, and then in the Grand Duchy of Lithuania. This article explores the polemical works of the representatives of the Polish State and the Grand Duchy of Lithuania such as Jan Ostroróg, Stanisław Orzechowski and other, the reception of Aristotle's ideas on mixed government in their works. The article notes opposed positions of elites in Poland and in the Grand Duchy of Lithuania on the role of the monarch, the rights of the Sejm and Rada. Depicted as the idea of the state independence of the Papacy and the Empire, Golden Liberty, noble democracy have been implemented in practice and in the main legal documents of the period.*

***Keywords:*** *Grand Duchy of Lithuania, the state sovereignty, the role of the monarch, the rights of Parliament and of the Sejm, political and legal thought.*